# ЛІТОЎСКА-ЯЦВЯЖСКІЯ ЎЗАЕМААДНОСІНЫ Ў XIII СТАГОДДЗІ

**Р. Ю. Урбановіч**

На пачатку XIII ст. ва Усходняй Еўропе ў выніку збегу рознага кшталту абставін склалася сітуацыя, у якой былыя цэнтры палітычнай магутнасці ў рэгіёне страцілі здольнасць кантраляваць ранейшыя сферы ўплыву, у выніку чаго актывізавалася вайсковая дзейнасць ваяўнічых балцкіх паганскіх плямёнаў, у тым ліку літоўцаў і яцвягаў. Павялічылася інтэнсіўнасць рабаўнічых набегаў на суседнія землі Галіцка-Валынскага княства, Мазовіі, Малапольшчы і г.д. Нярэдка гэтыя набегі здзяйсняліся некалькімі плямёнамі адначасова.

Так, у 1205 г. адбыўся сумесны літоўска-яцвяжскі рабаўнічы паход на валынскія землі [8, с. 722]. Аднак ужо ў 1219 г. паміж Галіцка-Валынскім княствам і групай літоўскіх князёў была заключана мірная дамова, якая меркавала пад сабою пэўна вайсковае супрацоўніцтва [8, с. 736.]. Між тым яцвяжскія набегі на галіцка-валынскія землі працягваліся [8, с. 451]. Гэта сведчыць аб тым, што на той час узровень палітычнай кансалідацыі паміж літоўцамі і яцвягамі (ды і вогуле балцкімі плямёнамі) быў адносна нізкі, і тыя ці іншыя сумесныя дзеянні былі абумоўленыя толькі часовымі інтарэсамі, і, адпаведна, не могуць сведчыць аб існаванні якой-кольвек больш развітай міжплямённай палітычнай структуры.

Падобная сітуацыя існавала на працягу ўсёй першай паловы XIII ст. У 1242 г. пачалося паўстанне супраць крыжакоў Тэўтонскага Ордэна ў Прусіі [11, с. 19]. Частковы ўдзел у ім прынялі як яцвягі [7, с. 40] так і літоўцы [6, с. 49], але і ў гэтым выпадку крыніцы не даюць ніякіх звестак аб тым, каб іхнія дзеянні былі хоць неяк скадрынаванымі. Больш за тое, існуе меркаванне што ўжо ў той час, у межах агульнай тэндэнцыі да развала якіх-кольвек палітычных сувязяў паміж балцкімі плямёнамі, пачынаюць афармляцца рысы літоўска-яцвяжскага канфлікта [3, с. 95]. Гэта звязваецца з памкненнем літоўскага князя Міндоўга аб'яднаць пад сваёй уладай літоўскія і іншыя суседнія балцкія землі [6, с. 47-51], што не магло не выклікаць незадаволенасці з боку кансерватыўнага яцвяжскага набілітэта.

Сваё далейшае развіццё гэты канфлікт атрымаў падчас канфлікта 1249-1252 гг., калі супраць Міндоўга выступілі нобілі Таўцівіл, Эдзівід і Выкінт [6, с. 51], якія здолелі заручыцца падтрымкай Галіцка-Валынскага княства, а таксама жамойтаў, яцвягаў і лівонцаў [8, с. 816]. Змушаны прымаць контрмеры, Міндоўг прыняў хрост, чым перацягнуў на свой бок крыжакоў [8, с. 815]. Такім чынам, склаліся два бакі канфлікта, паміж якімі пачаліся актыўныя вайсковыя дзеянні, у якіх прынялі ўдзел і яцвягі [8, с. 819].

Прынята лічыць, што ў 1252 г. Міндоўг здолеў перацягнуць на свой бок жамойтаў і яцвягаў [6, с. 54]. Гэты тэзіс грунтуецца на летапісным тэксце: *«прибеже Товтвил из Жамойть и ятвязь к Даниилу»* [8, с. 820]. У той жа час існуе і іншая інтэрпрэтацыя гэтага тэкста [2, p. 26], згодна якой яго трэба разглядаць як звесткі аб «уцёках» з Жамойці Таўцівіла і яцвягаў. Гэта дазваляе меркаваць аб тым, што на той час яцвягі яшчэ знаходзіліся ў стане вайны з літоўцамі. Далейшае развіццё падзей цалкам суадносіцца з гэтай пазіцыяй. Так, напрыклад, у 1253 г. Міндоўг падараваў частку яцвяжскіх земляў Тэўтонскаму Ордэну [2, p. 27].

Варажнеча паміж літоўцамі і яцвягамі існавала да 1260 г., калі адбылася бітва пры Дурбе [6, с. 63], параза ў якой крыжакоў выклікала серыю дробных паўстанняў супраць іх улады ў Лівоніі [6, с. 65] і чарговае паўстанне ў Прусіі [7, с. 93]. У гэты ж час Міндоўг разарваў усе свае сувязі з крыжакамі і вогуле хрысціянскім светам і распачаў палітыку актыўнай падтрымкі барацьбы балцкіх плямёнаў супраць крыжацкай агрэсіі [6, с. 65-66]. На гэтым этапе да балцка-крыжацкага канфлікта актыўна далучыліся і яцвягі [2, p. 30]. Адгэтуль можна казаць пра актыўную рэалізацыю балцкага накірунка палітыкі валадароў Літвы.

У 1263 г. Міндоўг быў забіты [8, с. 860], і, пасля кароткага перыяду кіравання Траняты, які працягваў балцкую палітыку Міндоўга [6, с. 67], літоўская дзяржава трапіла пад уплыў Галіцка-Валынскага княства, што звязваецца з кіраваннем ў Літве Войшалка і Шварна [8, с. 864; с. 868]. На гэты час Літва адыходзіць ад балцкага накірунку ў палітыцы, у тым ліку і ад тактыкі супольных вайсковых дзеянняў з яцвягамі, чые землі таксама трапілі ў той момант пад уплыў Галіцка-Валынскага княства [9, с. 109]. У 1269 г. у выніку рэакцыі паганскага літоўскага набілітэта на літоўскім стальцы апынуўся Трайдзень [8, с. 869], які зноўку актуалізаваў балцкі напрамак палітычнай актыўнасці літоўскай дзяржавы [6, с. 69]. З гэтага моманта пачынаецца найбольш актыўны этап сумесных літоўска-яцвяжскіх вайсковых дзеянняў, у якіх яцвягамі кіраваў вядомы нобіль Скуманд [3, s. 103]. У 1269-1274 гг. пад яго кіраўніцтвам было здзейснена некалькі вайсковых паходаў, у якіх яго падтрымлівалі літоўцы і падпарадкаваныя ім рускія войскі [7, с. 119; с. 122].

Негледзячы на актыўныя антыкрыжацкія дзеянні балцкай кааліцыі ў 1274 г. прускае паўстанне было падаўлена [4, с. 298]. У 1277 г. крыжакі распачалі заваяванне Судовіі – апошняй яцвяжскай зямлі, якая на той момант яшчэ заставалася незалежнай [7, с. 128]. Яцвягі рашуча супрацьстаялі крыжацкай агрэсіі, але сілы былі відавочна няроўнымі. Магчыма, антыкрыжацкая пазіцыя яцвяжскага набілітэта ў пэўнай ступені залежыла ад асабістых адносінаў з Трайдзеням; аб гэтым можна меркаваць па тым, што пасля яго смерці (1281 г. [8, с. 891]) пэўная частка яцвяжскіх нобіляў, сярод якіх быў і Скуманд, прыняла хрысціянства і перайшла на бок крыжакаў [7, с. 134]. Можна прыпусціць, што іх дачыненні з наступнымі валадарамі Літвы былі не самымі лепшымі, што і абумовіла такую радыкальную змену палітычнай арыентацыі [2, p. 36]. Так ці інакш, у 1283 г. Судовія была заваяваная [7, с. 197]. Гэтая дата з’яўляецца апошняй у палітычнай гісторыі яцвягаў. Пасля гэтага значная частка яцвягаў Судовіі сышла ў землі літоўскай дзяржавы, істотна паўплываўшы на стракатасць яе гідранімікі [1, s. 512; s. 601-602] і тапанімікі [5, с. 41-42]. Яцвягі, як тыя што перасяліліся ў ВКЛ у канцы XIII ст, так і тыя што жылі тут раней, уключыліся ў працэс фармавання літоўскай і беларускай народнасцяў [5, с. 41].

Такім чынам, можна зрабіць агульную выснову аб тым, што ў XIII ст. характар літоўска-яцвяжскіх узаемаадносін вызначаўся дзеяннямі літоўскага набілітэта і з’яўляўся адным са складнікаў балцкага накірунку палітыкі Літвы, змяняючыся на розных этапах ад адкрытага супрацьстаяння да сумеснай барацьбы супраць агульных ворагаў.

**Літаратура**

1. *Būga K.* Rinktiniai raštai: 3T. Vilnius: Valstybinė politinės ir mokslinės literatūros leidykla, 1958-1962. – T.3. – 1962.
2. *Dubonis A.* Yatvingians in the Genesis of Lithuanian Anti-Teutonic Orientation // Lithuanian historical studies. Vol 11. Vilnius, 2006. – p. 17-38.
3. *Powierski J.* Rola Jaćwieży w walce ludów bałtyjskich z agresją krzyżacką // Rocznik Białostocki, T. XIV. Warszawa, 1981. S. 87-116.
4. *Urban W.* The Prussian Crusade, 2nd ed. Chicago, Illinois, 2000.
5. *Внуковіч Ю.І.* Літоўцы Беларусі: этналагічнае даследванне. Мн., 2010.
6. *Гудавичус, Э.* История Литвы с древнейших времён до 1569 года. Т.1. М., 2005.
7. *Дусбург П.* Хроника земли Прусской. М., 1997.
8. Ипатьевская летопись / ПСРЛ. Т.2. 2-е изд-е. М., 2001.
9. *Крип'якевич І. П.* Галицько-волинське князівство. Київ, 1984.
10. *Пашуто В.Т.* Очерки по истории Галицко-Волынской Руси. АН СССР. Институт истории. М.
11. *Пашуто В.Т.* Помезания. «Помезанская правда» как исторический источник изучения общественного и политического строя Помезании XIII-XIV вв. / АН СССР. Ин-т истории. М., 1955.